# Якое яднае

высновy можна было зрабіць, мяркуючы па тым, колькі было ахвотных прыняць удзел у конкурсе. Такія мерапрыемствы дазваляюць дакрануцца да гісторыі нашай краіны і малой радзімы, даведацца пра беларускіх аўтараў і іх кнігі.

— Пераканаы, што ўсе, хто прыехаў на наша свята, атрымалі задавальненне ад роднага слова, ад тых мерапрыемстваў, якія тут адбыліся, — заўважыў карэспандэнту «Звязды» **старшыня абласнога аргкамітэта свята ў Бялынічах, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.** — Вельмі важна, што ў гэты дзень прадстаўнікі ўлады, культуры, мастацтва, жыхары былі разам і разам спявалі здравіцу нашай мове.




## Статут ВКЛ і квэст паводле Караткевіча

Каля царквы ў гонар іконы Бялыніцкай Божай Маці была ўрачыста адкрыта скульптура, якая ўшаноўвае святы вобраз. Ікона XVII стагоддзя з'явілася вернікам цудоўным чынам. Па словах скульптара, Аляксандра Мінькова, гэта хацелі перадаць і ў помніку. Цяпер плошчу каля царквы ўпрыгожвае гранітны анёл, ён і прынёс людзям цудадзейную ікону, якая аберагае горад.

Адкрывалі новую славутасць намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка, міністр культуры Юрый Бондар, міністр інфармацыі Ігар Луцкі, прадстаўнікі духавенства і мясцовай улады.

Урачыста расчыніў свае дзверы і Бялыніцкі мастацкі музей імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі. У новым музеі ўсе ахвотныя могуць азнаёміцца з карцінамі знакамітага земляка, гісторыяй бялыніцкага краю. Упершыню ў музеі з'явілася зала «Духоўнасць». Цэнтральным экспанатам стала фрэска «Узыходжанне на Галгофу».

— Новы выдатны музей Бялыніцкага-Бірулі абсталяваны ўсімі сучаснымі тэхналогіямі. Ён будзе радаваць не толькі жыхароў Бялыніцкага раёна, але і ўсю нашу краіну. Сюды будзе прыязджаць шмат экскурсій. Плануюцца адпаведныя ўрокі для дзяцей, каб яны шанавалі гісторыю нашай краіны і ведалі, якія выдатныя людзі ў нас ёсць. Магілёўшчына — вельмі маляўнічы край, і ўсё гэта відаць у пейзажах Бялыніцкага-Бірулі, — адзначыў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** — Падчас падрыхтоўкі свята праведзена вялікая арганізацыйная работа з боку Магілёўскага аблвыканкама, Бялыніцкага райвыканкама. Мы ўсе бачым, як змяніўся горад. Мы рады праводзіць такое адметнае свята ў прыгожых, цікавых Бялынічах.



У гарадскім парку была закладзена Алея гарадоў-сталіц Дня беларускага пісьменства, якая сімвалізуе еднасць і дружбу беларускіх гарадоў.

Гаспадыняй свята беларускага пісьменства была, безумоўна, кніга. Кожная выстаўка, імпрэза, конкурс аддавалі ёй даніну павагі. Дзякуючы Дзяржаўнаму музею гісторыі беларускай літаратуры і яго філіялам на свята завіталі Кузьма Чорны, Якуб Колас, Янка Купала. Тэматычныя выстаўкі паказвалі ўсім вядомых творцаў з новых бакоў. Напрыклад, раскрывалі Якуба Коласа, у першую чаргу, як грамадскага дзеяча ці расказвалі пра адносіны Янкі Купалы з яго сябрамі і літаратарамі. Сімвалічным было прадстаўленне экспазіцыі «Кузьма Чорны. Чалавек — гэта цэлы свет». Сёлета адзначаецца 120 гадоў з дня нараджэння майстра.

У 2020-м спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча. І кожны наведвальнік Дня беларускага пісьменства меў унікальную магчымасць пабыць героем легендарнага твора «Чорны замак Альшанскі». Згодна з правіламі літаратурнага квэсту, удзельнікі павінны былі знайсці ўнікальны артэфакт. Так у Бялынічы прыйшлі князь Вітаўт Альшанскі, воін Грэміслаў Валюжыч і княгіня Ганна-Гардзіслава Альшанская. Выкананне іх заданняў прывяло ўдзельнікаў да каштоўнага прыза, новай кнігі «Як маленькія сябры найвялікшы скарб шукалі» Ліны Багданавай.

«Чорны замак Альшанскі» — неверагодны твор, якому неабходна аддаць даніну павагі. І ўсе ўдзельнікі гэта адзначалі», — падкрэслілі арганізатары. Ініцыятыва Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь прыйшлася даспадобы ўсім удзельнікам квэсту, на які прайшло каля 500 чалавек.



Азнаёміцца з кніжнымі навінкамі і цікавымі творамі можна было на фестывалі кніг і прэсы, які дзейнічаў на працягу ўсяго свята. У павільёнах праходзілі тэматычныя экспазіцыі, прэзентацыі і інтэрактыўныя пляцоўкі — «Кнігі і прэса Рэспублікі Беларусь», «Слова пісьменніка» і іншыя. Аматары сучаснай беларускай літаратуры мелі магчымасць асабіста пазнаёміцца са сваімі кумірамі падчас паэтычных сустрэч і прэзентацый абласных аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Вялікую цікавасць госці свята праявілі да стэнда выдавецкага дома «Звязда».

Не толькі прачытаць, але і ствары́ць кнігу мог кожны наведвальнік павільёна «Друкарскі двор XVI стагоддзя». Гэта стала магчыма дзякуючы гісторыку Уладзіміру Ліхадзедаву. Ну як жа прайсці міма і не паспрабаваць сваімі рукамі зрабіць паперу... Аказалася, выраб паперы — справа амаль што ювелірная. Усё пачынаецца са студзяністай масы з лёну, растворанай у вадзе. Спецыяльным невялікім сітам зачэрпваецца гэтая маса, сцэджваюцца лішкі вады. І цуд — на сіце з'яўляецца нешта падобнае на звыклы ліст паперы. Потым у адмысловым прыстасаванні яго трэба адправіць пад прэс. Каб усё зрабіць якасна, трэба прыкласці вялікую сілу. Без дапамогі мужчыны-майстра не абышлося. Аказваецца, жаночая справа пісаць на паперы, а не рабіць яе. Апошні этап — зняць старонку з рамкі і пры гэтым не парваць. Працэс гэты патрабуе максімальнай акуратнасці і тонкасці. Адзін няправільны рух, і ліст сапсаваны. Новананароджаны аркуш паперы адпраўляецца сушыцца. Куды працей, але не менш цікава друкаваць на сухой паперы. Закласці аркуш у рамку, пафарбаваць аснову, зрабіць адбітак — і гатова, справа першых друкароў ажывае ў XXI стагоддзі.

«Друкарскі двор» — частка вялікага праекта «У пошуках страчанага», які я рэалізую ўжо 16 гадоў. Нам хацелася прайсці шлях нашага першадрукара Францыска Скарыны. Па старых чарцяжах стварылі станок і абсталяванне для вырабу паперы. На сённяшнім Дні беларускага пісьменства мы прадставілі навінку — адрадзілі беларускую батлейку. У ёй паказалі знакамітую казку «Беласнежка і сем гномаў», дзе гномы таксама займаюцца друкарскай справай. Дзеці і дарослыя могуць паглядзець прадстаўленне, а потым самі зрабіць паперу», — расказаў ініцыятар пляцоўкі Уладзімір Ліхадзедаў.

Падчас Дня беларускага пісьменства ажылі і кнігі па гісторыі Магілёўшчыны, і старажытная летапісы. На тэматычных пляцоўках можна было ўбачыць фрагмент берасцяной граматы, які знайшлі на Замкавай гары ў Мсціславе, выстаўку, прысвечаную Баркулабаўскаму летапісу, прыклады партызанскага друку. Музей гісторыі Магілёва прадставіў сваю жамчужыну — Статут Вялікага Княства Літоўскага выдання 1594—1595 гадоў, адзіны экзэмпляр на тэрыторыі Беларусі. Гуляючы па вуліцы сучаснага горада, людзі пападалі ў дзясяткі, сотні гадоў назад.



Пасля духоўнай ежы варта пакаштаваць і прысмакаў. І з гэтым на свяце праблем не было, але пананаванне кнігі адчувалася і тут. Аблспажыўсаюз здзіўляў творамі мастацтва з прадуктаў. Фестываль «БелаЕжа» праводзіўся на Дні беларускага пісьменства ўпершыню, паведаміў **намеснік старшыні праўлення Магілёўскага аблспажыўсаюза Сяргей ШЧЭРБІЧ.** Першыя дыпломы на ім атрымалі Дрыбінская і Бялыніцкая райспажыўкааперацыі за выкананне нацюрморта і кнігі ў выглядзе кандытарскіх вырабаў.

Дзень беларускага пісьменства сабраў у Бялынічах гасцей з рознымі інтарэсамі і поглядамі. Але насычаная фестывальная праграма дазволіла кожнаму знайсці сабе штосьці пад густ. Свята атрымалася такім жа шматгранным і разнастайным, як літаратура і ўсё беларускае пісьменства.

**Валерыя СЦЯЦКО, Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**